3. *Исаенко В. Ф.* Неолит Припятского Полесья / АН БССР, Ин-т истории; Ред. Д. Я. Телегин. Мн., 1976.
4. *Калечиц Е. Г.* Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Науч. ред. Д. Я. Телегин. Мн., 1987.
5. *Калечиц Е. Г.* Человек и среда обитания. Восточная Беларусь. Каменный век. Мн., 2003.
6. *Копытин В. Ф.* Памятники финального палеолита и мезолита Верхнего Поднепровья. Могилев, 1991.
7. *Ксензов В. П.* Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья / Науч. ред. Н. Н. Гурина. Мн., 1988.
8. *Ксензов В. П.* Мезолит Северной и Центральной Беларуси / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; Навук. рэд. І. М. Язэпенка. Мн., 2006.
9. *Чарняўскі М. М.* Неаліт Беларускага Панямоння / АН БССР, Ін-т гісторыі; Нав. рэд. Д. Я. Цялегін. Мн., 1979.
10. *Ашэйчык В. У.* Да пытання аб жытлах Юравіцкай і Бердыжскай верхнепалеалітычных стаянак // САЗ: Студэнцкі археалагічны зборнік / БДУ, Гістарычны ф-т; Навук. рэд. В. С. Абухоўскі. Мн., 2007. Вып. 1. С. 8–18.
11. *Зализняк Л. Л.* Население Полесья в мезолите / АН УССР, Ин-т археологии; Отв. ред. Д. Я. Телегин. Киев, 1991.
12. *Кларк Дж. Г. Д.* Доисторическая Европа: Экономический очерк / Пер. с англ. М. Б. Граковой-Свиридовой. М., 1953.
13. Археалогія Беларусі: У 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мн., 1997–2003. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі, У. Ф. Ісаенка, А. Г. Калечыц і інш.; Пад. рэд. М. М. Чарняўскага, А. Г. Калечыц. Мн., 1997.

## АНАЛІЗ СУЧАСНАГА СТАНУ МУЗЕЯЎ ВНУ Г. МІНСКА

**П. Ю. Бандаровіч**

У сучасным свеце ўсё большую значнасць набывае універсітэцкая адукацыя. Яе сутнасць – усебаковае развіццё асобы асобы з мэтай выхавання здольнага і перспектыўнага маладога пакалення. І для дасягнення гэтай мэты вельмі вялікая ўвага надаецца сёння універсітэцкім музеям, што недзіўна, так як яны маюць вельмі вялікі адукацыйна-выхаваўчы патэнцыял. Ужо з сярэдзіны 1990-х гг. у складзе Міжнароднага савета музеяў існуе міжнародны камітэт універсітэцкіх музеяў і калекцый, які вядзе статыстыку, выдае свой часопіс, штогод праводзіць семінары і канферэнцыі пад дахам буйнейшых універсітэцкіх музеяў свету. Нажаль, дакладных колькасных дадзеных па музеях гэтай групы ў Беларусі няма, што тлумачыцца адсутнасцю адзінага каардынацыйна-метадычнага цэнтра.

Між тым колькасць універсітэцкіх музеяў сёння павялічваецца. Напрыклад, у Мінску, дзе знаходзяцца большасць вышэйшых навучальных установаў Беларусі, амаль кожная з іх мае альбо хоча мець уласны

музей ці аматарскае фарміраванне музейнага тыпу (мемарыяльны пакой, залу гісторыі, краязнаўчы кабінет, куток).

Усе універсітэцкія музеі ўмоўна можна раздзяліць на дзве прыблізна аднолькавыя па колькасці групы – музеі, якія адлюстроўваюць тую ці іншую профільную дысцыпліну (напрыклад, нумізматыка) і біяграфічныя музеі, якія знаёмяць наведвальніка з гісторыяй навучальнай установы. На сёняшні дзень у горадзе Мінску налічваецца каля 35 ВНУ. Музеяў жа 26, з іх 12 прысвечаны пэўным навуковым дысцыплінам, а 14 – біяграфіі навучальнай установы.

Сярод існуючых сёння музеяў адзін са старэйшых – Музей гісторыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта. Адчынены ён быў у 1978 г. і да цяперашняга часу не змяняў сваёй экспазіцыі. Плошча яго складае 180 кв. метраў і на ёй экспаніруецца каля 1500 прадметаў, дакументаў і фотаздымкаў. Незвычайны па сваёй экспазіцыі музей Камандна-інжынернага інстытута Міністэрства надзвычайных сітуацый Рэспублікі Беларусь, сабранне якога налічвае каля 500 экспанатаў, якія размяшчаюцца ў двух залах агульнай плошчай 75 кв. метраў. Незвычайнасць музея ў тым, што, з’яўляючыся біяграфічным музеем ён адкрывае таксама старонкі з гісторыі пажарнай справы. Музей гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта быў адчынены 16 траўня 1997 г. (20 траўня – дзень народзінаў універсітэта). На плошчы ў 144 кв. метры размяшчаецца амаль увесь фонд музея – каля 5 тысяч прадметаў. Сярод экспанатаў – фотаздымкі, кнігі, дыпломы і ўзнагароды, 44 альбомы з фотаздымкамі выпускаў розных гадоў. Адкрыццё музея Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыё-тэхнічнага каледжа адбылося ў траўні 1999 г. Па сваім маштабе ён невялікі – усяго 25 кв. метраў, на якіх экспануюцца 600 прадметаў. Па іх можна прасачыць гісторыю навучальнай установы, яе пераўтварэнне са спецыяльнай у вышэйшую, пазнаёміцца з дасягненнямі ўстановы ў спорце, яе сувязямі і г. д. Музей беларускіх народных музычных інструментаў, які размяшчаецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, быў адчынены ў кастрычніку 1999 г. На плошчы 36 кв. метраў размешчаны каля 110 прадметаў, якія раздзелены па тыпах інструментаў – самагучальныя, духавыя, струнныя і інш. Музей гісторыі Мінскага авіякаледжа ўпершыню раскрыў свае дзверы ў 1983 г. Гэтая падзея была прымеркавана да 60-годдзя грамадзянскай авіяцыі. Затым ён быў часова згорнуты і новая экспазіцыя ўрачыста адкрылася 9 траўня 2000 г. У памяшканні музея, якое нагадвае сабой самалёт, размясціліся больш за 1500 экспанатаў, якія расказваюць аб гісторыі не толькі самаго каледжа, але наогул усёй беларускай авіяцыі і аб людзях, якім яна абавязана. Пры следча-

экспертным факульцеце акадэміі МУС працуе незвычайны музей крыміналістыкі Міністэрства ўнутраных спраў. Адчынены музей 4 сакавіка 2001 г., у гонар Дня міліцыі. Размяшчаецца ў двух залах агульнай плошчай каля 140 кв. метраў. Калекцыя, якая складаецца з 970 экспанатаў, уключае ў сябе: 258 адзінак зброі, прыбор начнога бачання, 115 адзінак боепрыпасаў, 38 несапраўдных грашовых знакаў, 27 копіяў дакументаў, 261 фотаздымак. Пры Міжнародным гуманітарна-эканамічным інстытуце з 2002 г. існуе Музей спартовай славы МГЭІ. Інстытут гэты з'яўляецца камерцыйным і спартыўны накірунак у ім мае прыярытэт. У ім вучыліся такія спартсмены, як Зміцер Дашчынскі, Яўгення Паўліна, Аляксей Айдараў, Аляксандр Сыман, Шыкаленка Наталля і іншыя. Экспанатаў – каля 200, у большасці сваёй гэта ўзнагароды і фотаздымкі. Музей гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта фізічнай культуры першы раз быў адчынены ў траўні 1987 г. У 2000 годзе быў зачынены на рэканструкцыю і ўрачыста адчынены ў верасні 2002. Каля 600 экспанатаў (у асноўным – фотаздымкі, падарункі і шмат узнагародаў – медалёў, значакаў, кубкаў) размясціліся на плошчы 76 кв. метраў. Сярод прадметаў, якімі ганарыцца музей – барцоўкі А. Мядзведзя, Алімпійскі медаль І. Ушаковай, мячы футбалістаў «Дынама» – чэмпіёнаў СССР 1982 г. і інш. Пры аддзеле вучэбна-выхаваўчай працы Вышэйшага дзяржаўнага каледжа сувязі існуе музей гісторыі Вышэйшага дзяржаўнага каледжа сувязі. Адчынены ён быў 7 траўня 2003 г. (Дзень супрацоўнікаў тэлебачання, радыёвяшчання і сувязі). Плошча музея – 70 кв. метраў, на якіх размешчаны фонд – больш за 300 прадметаў. Экспазіцыя распавядае не толькі аб гісторыі каледжа, але і пра стварэнне і развіццё сродкаў сувязі, тут выстаўлены ўзоры старых тэле- і радыёпрыбораў, тэлефонаў, прайгравальнікаў і г. д. Тая экспазіцыя, якую можна сёння ўбачыць у музеі гісторыі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага універсітэта – ужо не першая. Яшчэ 13 кастрычніка 1979 г., на 25-годдзе ВНУ быў адчынены музей гісторыі. Затым, у пачатку 2000-х была праведзена рэканструкцыя і адноўленая экспазіцыя разгарнула свае дзверы ўжо на 50-гадовы юбілей, у 2004 г. Агульная плошча музея – 126 кв. метраў, фонд музея складае: 2131 прадмет асноўнага фонду і 709 – навукова-дапаможнага. Музей гісторыі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта першы раз адчыніў свае дзверы ў гонар свайго 60-годдзя, у 1980 г. З 2003 г. ён – на рэканструкцыі і 23 лістапада 2005 г., у 75-годдзе ВНУ зноўку прыняў першых наведвальнікаў. Больш за 1000 экспанатаў знаёмяць наведвальніка з гісторыяй ВНУ, яго сучаснай структурай, кіраўніцтвам і ганаровымі людзьмі. 15 сакавіка 1984 г., на 20-гадовы юбілей Мінскага радыё-

тэхнічнага інстытута быў адчынены музей яго гісторыі. У 2004 г. была адкрыта новая экспазіцыя – музей гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Экспазіцыя з 1000 экспанатаў знаёміць наведвальнікаў з гісторыяй універсітэта, спецыяльнасцях, якія ў ім можна атрымаць, навуковыя распрацоўкі ВНУ, яе ўзнагароды за спартовыя і навуковыя дасягненні, паказвае значэнне ўніверсітэта для навукі і краіны ў цэлым. Музей гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта пачынаецца яшчэ ў 1978 г. Сучасная экспазіцыя была адкрыта 27 кастрычніка 2006 г. і была прымеркавана да 85-годдзя універсітэта. Фонд на цяперашні час складае 7465 музейных прадметаў, з якіх: дакументаў і рэчавых крыніц – 1948, фотаздымкаў – 3256, кніг і літаратуры – 347, дакументаў у асабовых справах – 1914. Музей гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка пачаў ствараццa ў 1989 г. і адкрыты ў верасні 1990 г. У 2006 г. пачалося стварэнне новай экспазіцыі, якая і была ўрачыста адкрыта 26 лютага 2007 г. Фонд складае больш 2000 прадметаў, у асноўным гэта дакументы, фота- і відэаматэрыялы, рэчавыя прадметы.

Падводзячы вынік можна сказаць, што стварэнне універсітэцкіх музеяў у горадзе Мінску ідзе дастаткова паспяхова. Не можа не радаваць той факт, што большая палова музеяў адчыніліся альбо праходзіла стадыю рэканструкцыі пасля 2000 г. Станоўча можна адзначыць таксама энтузіязм і фантазію супрацоўнікаў музеяў, а таксама выкладчыкаў і студэнтаў, якія спрабуюць выкарыстоўваць музей рознымі незвычайнымі спосабамі – напісанне з яго дапамогай рэфератаў і курсавых прац; правядзенне там практычных заняткаў і інш.

Разам з тым нельга абысці недахопы музеяў. Перш за ўсё гэта невялікія плошчы. Выклікана гэта ў першую чаргу тым, што музеі звычайна знаходзяцца ў галоўных карпусах універсітэтаў, дзе вольных плошчаў звычайна няшмат. І музей у гэтым спаборніцтве, нажаль, займае не прыярытэтнае месца.

Вельмі вострым недахопам з’яўляецца таксама адсутнасць кваліфікаваных кадраў. Сталыя супрацоўнікі музеяў альбо адсутнічаюць увогуле, альбо іх месцы займаюць асобы без спецыяльнай адукацыі. Першы выпадак характэрны для невялікіх устаноў, перш за ўсё каледжаў, дзе які-небудзь супрацоўнік ВНУ з’яўляецца адначасова і загадчыкам музея. Другі ж выпадак (характэрны для буйных ВНУ) – калі супрацоўнік ёсць, але асноўная яго спецыяльнасць іншая. Вырашыць гэтую праблему можна двума спосабамі: першы – арганізаваць міжуніверсітэцкія курсы па тэорыі і практыцы музейнай справы, а другі – браць на працу ўжо кваліфікаваных спецыялістаў.

Але ўсё-ж-такі можна ўпэўнена сказаць, што справа музеяў ВНУ ў Беларусі ідзе ўгару, і трэба спадзявацца, што тэмпы яе не замарудзяцца, а наадварот паскорацца. У такім выпадку нашыя музеі будуць развівацца і далей і маюць магчымасць перайсці на якасна новы, еўрапейскі ўзровень.

## СИСТЕМА СОКРАЩЕНИЙ КИЕВСКОЙ ПСАЛТИРИ 1397 ГОДА

**Т. П. Божко**

Кириллическое письмо, созданное на основе греческого устава, переняло из него не только графическую форму значительного количества букв, но и систему сокращений, которая со временем была доработана местными переписчиками и существовала независимо как неотъемлемая часть старославянского языка. Характер сокращений в славянской письменности связан с видом письма (устав, полуустав, скоропись).

Уставное письмо продолжало свое существование даже после появления полуустава и скорописи. Возникает вопрос, почему уставное письмо и близкие к нему разновидности полуустава существовали так долго, не смотря на появление более удобной и практичной скорописи, а в некоторой части общества и после появления печатных изданий (старообрядцы). Во-первых, это было традиционное письмо для православной церкви, а традиции, как известно, ломать трудно. В IX веке это письмо пришло практически одновременно с новой религией и было неотъемлемой частью православия в сознании верующих и духовенства. Кроме того, на наш взгляд, существовала и практическая необходимость сохранения устава, т.к. читать его значительно проще, в силу геометрической формы букв, минимального влияния почерка переписчика, большого размера букв и т.д. Данный фактор имел большое значение непосредственно в богослужебной сфере (т. е. использование книг во время церковной службы), во время учения читать (как известно в средневековье учебником для чтения служила в основном Псалтирь). Также сохранение устава было одним из способов разграничения церковной сферы и деловой, которая использовала скоропись.

Одной из характерных черт уставного письма является небольшое количество сокращений. Ученые давно ведут дискуссии о времени и причинах появления сокращений, их функциях и задачах. Одни делают акцент на практических аспектах, другие – на сакрально-символических, третьи стараются соединить их. Говорить о причинах появления и развития системы славянских сокращений можно только в результате изучения конкретных памятников письменности. С этой целью был проведен анализ письма Киевской Псалтири 1397 года (непосредственным источ-